# Гімназіі на Нагавагрудчыне

**А. А. Анікевіч,**
дырэктар спецшколы-інтэрната г. Навагрудка
**І. В. Хуан,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай кваліфікацыйнай катэгорыі
спецшколы-інтэрната г. Навагрудка

**Гімназія як тып навучальнай установы ўзнікла яшчэ ў старажытнай Грэцыі. Напачатку гэта былі проста месцы, дзе маладыя людзі займаліся гімнастыкай. Пазней у гімназіі пачынаюць выкладаць танцы, музыку, фехтаванне, верхавую язду, рыторыку. Гімназіі знайшлі шырокае распаўсюджанне ў дзяржавах Малой Азіі, Рымскай імперыі. Другі ўсплеск цікавасці да гімназій прыпадае на XVI стагоддзе, калі ў Германіі, Нідэрландах, Францыі пачынаюць узнікаць сярэднія школы – іх таксама называюць гімназіямі. Нягледзячы на непрынясцце прадстаўнікамі хрысціянскай вярхушкі ўсяго, што звязана з язычнікамі, назва «гімназія» прыжылася ў хрысціянскай Еўропе.**

## З гісторыі ўзнікнення гімназій

Навучанне ў гімназіях вялося на лацінскай мове. Вывучаліся прадметы: арыфметыка, астраномія, музыка, этыка, класічныя мовы і прадметы багаслоўскага накірунку. У эпоху Адраджэння і Рэфармацыі ў асвеце ўзнікае шэраг напрамкаў, якія прынята называць класічнымі. Першай установай, дзе навучанне адбывалася не на схаластычнай аснове, стала гімназія ў Нюрнбергу, яна была заснавана Меланхатонам у 1526 годзе. Вывучаліся ў новых гімназіях усе папярэднія прадметы і ў дадатак прадметы прыродазнаўчага цыклу. Нягледзячы на прысутнасць у гімназіях багаслоўскага накірунку, уплыў царквы на такія ўстановы быў невялікі. Ужо ў канцы XVI стагоддзя гімназіі становяцца ўстановамі па падрыхтоўцы юнакоў да паступлення ва ўніверсітэт. Паступова рэлігійныя прадметы поўнасцю выводзяцца з гімназій, адукацыя ў іх становіцца выключна свецкай. Тут пачынаюць вывучаць грамадзянскую гісторыю, мінералогію, геаграфію, маляванне, спевы, гімнастыку.

Першая гімназія ў Расіі была заснавана 2 мая 1701 года ў Маскве нямецкім святаром Эрнстам Глюкам. Гэтая ўстанова была больш падобная на антычную, чым на еўрапейскую. Вывучалі ў ёй фехтаванне, верхавую язду, стральбу, грэблю, танцы, гульні. Першая класічная гімназія еўрапейскага кшталту была адкрыта ў 1726 годзе.

У XIX стагоддзі, згодна з «Папярэднімі правіламі народнай асветы», зацверджанымі 24 студзеня 1803 года Аляксандрам I, гімназіі ствараліся ва ўсіх губернскіх гарадах. Гэта былі ўсесаслоўныя навучальныя ўстановы, тэрмін навучання ў якіх быў 4 гады. Тут вывучалі матэматыку, гісторыю, геаграфію, статыстыку, філасофію, грамадзянскую гісторыю, лацінскую мову, нямецкую мову, французкую мову, рускую мову. Дадаткова вывучаліся польская мова і «нрававучэнне».

У Віленскай вучэбнай акрузе тэрмін навучання ў гімназіі быў 6 гадоў. Звычайна штат гімназіі складаўся з 8 педагогаў: чатыры малодшыя настаўнікі і чатыры – старэйшыя. Старэйшыя настаўнікі выкладалі галоўныя, абавязковыя для вывучэння прадметы, малодшыя – неабавязковыя і тыя прадметы, што вывучаліся ў 1 і 2 класах. У Віленскай вучэбнай акрузе ў гімназіях было па 6 старэйшых настаўнікаў: фізічных ведаў, матэматыкі, «нрававучэння», славеснасці, лацінскай мовы, польскай і лацінскай моў (для малодшых класаў). Да ліку малодшых настаўнікаў адносіліся настаўнікі малявання, рускай мовы, французкай мовы, нямецкай мовы.

Гімназію ўзначальваў дырэктар, яго функцыі заключаліся ў кантролі за работай выкладчыкаў, за вучобай і паводзінамі навучэнцаў. Галоўнымі задачамі гімназіі гэтага перыяду былі: падрыхтоўка выпускнікоў да паступлення ва ўніверсітэт; выхаванне моладзі добрымі грамадзянамі краіны; падрыхтоўка навучэнцаў да атрымання настаўніцкага звання з правам выкладання ва ўстановах пачатковага звяна (прыходскіх школах, павятовых вучылішчах, прыватных навучальных установах). Ужо ў 1828 годзе, згодна са Статутам гімназій, зацверджаным 8 снежня 1828 года, задачы гімназій змяніліся і звузіліся: ажыццяўляць падрыхтоўку выпускнікоў да паступлення ва ўніверсітэты і даваць добрае выхаванне.

З гэтага часу гімназіі дзеляцца на класічныя (тэрмін навучання 7 гадоў) і рэальныя (тэрмін навучання 6 гадоў). Да ліку новаўвядзенняў гэтага перыяду варта дадаць наступныя: стварэнне ў гімназіях педагагічных саветаў; увядзенне ў штатны расклад гімназій пасады інспектара (прызначаўся з ліку старэйшых настаўнікаў для кантролю за парадкам і для вядзення гаспадаркі ў пансіёне); увядзенне звання «Ганаровага папячыцеля», у абвязкі якога ўваходзіла ажыццяўляць агульны надзор за парадкам; увядзенне фізічных пакаранняў вучняў; павелічэнне аплаты за навучанне ў гімназіі да 20 руб.

Аднак трэба сказаць, што Статут 1828 года стаў дзейнічаць толькі ў 1837 годзе. А ўжо ў 1849 годзе ў яго былі ўнесеныя змены, якія рэгламентавалі дыферанцыраваны падыход у ажыццяўленні навучання ў гімназіі на кожным этапе. Згодна са зменамі ў першых трох класах вывучалі:

1. Закон Божы – 2 г. на тыдзень (далей – 2 г.)
2. Рускую і славянскую мовы – 4 г.
3. Матэматыку – 4 г.
4. Геаграфію – 1 кл. – 2 г; 2 кл. – 3 г.; 3 кл. – 5 г.
5. Нямецкую мову – 3 г.
6. Французкую мову – 3 г.
6. Чыстапісанне – 1 – 2 кл. – 4 г.; 3 кл. – 3 г.

7. Чарчэнне і маляванне – 1 г.

Старэйшыя класы:

1. Закон Божы – 4 кл. – 2 г.; 5 – 7 кл. – 1 г.
2. Рускую і славянскую мовы – 4 – 7 кл. – 8 г.
3. Фізіку і геаграфію – 5 – 7 кл. – 2 г.
4. Матэматыку – 5 – 7 кл. – 3 г.
5. Гісторыю ўсеагульную і рускую – 4 кл. – 4 г.; 5 – 7 кл. – 3 г.
6. Нямецкую мову – 4 – 7 кл. – 3 г.
7. Французкую мову – 4 – 7 кл. – 3 г.
8. Чарчэнне і маляванне – па выбару – 4 – 7 кл. – 1 г.

Для тых, хто рыхтаваўся пайсці на дзяржаўную службу пасля заканчэння гімназіі, дадаткова ўводзіліся наступныя прадметы:

1. Руская і славянская мовы – 4 кл. – 2 г.
2. Матэматыка – 4 кл. – 2 г.
3. Рускае законазнаўства – 5 – 7 кл. – 4 г.

Для тых гімназістаў, якія пасля заканчэння вучобы рыхталіся да паступлення ва ўніверсітэт:

1. Лацінская мова – 5 – 7 кл. – 4 г.
2. Грэчаская мова – 5 – 7 кл. – 2 г. (па жаданні вучня)

30 ліпеня 1871 года па ініцыятыве міністра народнай асветы графа Д. А. Талстога быў зацверджаны новы статут для гімназій. Згодна з ім, усе гімназіі падзяляліся на класічныя і прагімназіі. У класічных гімназіях вялося выкладанне класічных моў і навучанне доўжылася сем і восем гадоў (у 7 класе навучанне ажыццяўлялася два гады). Прагімназіі былі з шасцігадовым тэрмінам навучання. Існуючыя рэальныя гімназіі былі пераведзены ў статус рэальных вучылішч. Дакумент істотна змяніў вучэбны працэс у гімназіях. Сярод новаўвядзенняў былі: уключэнне ў вучэбны план прадмета «Логіка»; змяншэнне колькасці гадзін на чыстапісанне; змяншэнне гадзін на вывучэнне прадметаў: «Закон божы» і «Гісторыя»; дазвол на выкладанне некалькіх праметаў адным настаўнікам; ускладанне на настаўнікаў выхаваўчых функцый; ускладанне на дырэктара і інспектара абавязкаў па выкладанню вучэбных прадметаў (не больш за 12 гадзін на тыдзень); увядзенне ў штатны расклад гімназіі пасады класнага настаўніка па 1 стаўцы на кожны клас; устанаўленне фіксаванай платы за навучанне (у залежнасці ад рэгіёна) – ад 15 да 60 рублёў; адкрыццё пры гімназіях пачатковых класаў.

Рэформу графа Талстога грамадства ўспрыняла негатыўна. У 1901 годзе былі ўнесены змены ў рэформу: з 1902/1903 навучальнага года адмянілі выкладанне лацінскай мовы ў 1 – 2 класах; адмянілі выкладанне грэчаскай мовы ў 3 – 4 класах; гімназіі набываюць статус усесаслоўных навучальных ўстаноў; была ўстаноўлена працягласць навучальнага года – 240 дзён (з 17 жніўня па 1 чэрвеня); устанаўліваўся час прыёму ў першы клас – май месяц. У астатнія класы – жнівень.

Міністэрства народнай асветы выдае загад ад 15.03.1905 года аб увядзенні ў гімназіях перавадных экзаменаў з класа ў клас.

Аплата працы дырэктара гімназіі складала 2000 руб на год і ў дадатак дзяржава аплачвала кватэру. Інспектар атрымліваў 1500 руб і таксама ажыццяўлялася аплата кватэры. Настаўнік у першыя пяць гадоў сваёй працы атрымліваў 60 рублёў на год за адзін урок, а пасля адпрацоўкі 5 гадоў – 75 рублёў за 12 урокаў і па 60 рублёў за астатнюю колькасць урокаў. Аплата працы настаўніка старажытных моў складала 100 руб за адзін урок на працягу года. Пасля 4 гадоў працы ў гімназіі настаўніку прысвойваўся чын «калежскага асэсара» – 7-мы чын па табелі аб рангах.

У 1892 годзе ў Расіі было 180 гімназій. У Віленскай вучэбнай акрузе – 2 гімназіі і адна прагімназія. Колькасць навучэнцаў гімназій складала 4140 вучняў, з іх дваранскага саслоўя – 2462, духоўнага – 129, гарадскога саслоўя – 1206, сельскага саслоўя – 286, іншаземцаў – 51 вучань.

## Гімназія ў Навагрудку

Першая гімназія ў Навагрудку была адчынена 01 верасня 1858 года на базе закрытага пяцікласнага дваранскага вучылішча. Цырымонія адкрыцця гімназіі добра вядома дзякуючы газетнаму артыкулу, прысвечанаму гэтай падзеі. Адкрыццё пачалося з урачытай месы ў Міхайлаўскім касцёле, якую адслужыў ксёнз Ф. Бедрыжынскі ў гонар новай навучальнай ўстановы. Штат гімназіі складаўся з 15 чалавек. Акрамя ксянза Фелікса Фадзеявіча Бедрыжынскага, які быў прызначаны законавучыцелем для каталіцкай часткі вучняў, у склад штата гімназіі ўваходзілі: Іаан Ігнатавіч Чудакоўскі – свяшчэннік праваслаўнай канфесіі – законавучыцель; інспектар і старэйшы настаўнік матэматыкі і фізікі Эдмунд Бенядзіктавіч Бяляўскі; старэйшы настаўнік лацінскай і польскай моў Данат Вікенцьевіч Коўзун; старэйшы настаўнік гісторыі і польскай мовы Рамуальд Ільіч Кабецкі; старэйшы настаўнік гісторыі Парфірый Якаўлевіч Чайкоўскі; старэйшы настаўнік рускай мовы Міхаіл Аляксеевіч Дзмітрыеў.

Кіраўніком установы на першым этапе работы гімназіі быў былы дырэктар Навагрудскага дваранскага вучылішча В. Лебедзяў. Ужо ў 1859 годзе дырэктарам прызначаюць Чашніцкага Фелікса Фадзеевіча. Кошт навучання ў гімназіі складаў 10 руб на год. Аднак частка маламаёмасных вучняў ад аплаты была вызвалена. У першы год працы гімназіі тут навучалася 174 вучні, а праз год, у 1860/1861 навучальным годзе, ужо – 276. Ад аплаты было вызвалена толькі 15 чалавек. У наступным 1861/1862 навучальным годзе налічвалася 322 вучні, а ў 1868 годзе (на момант закрыцця) – 350 чалавек. Прыведзеная статыстыка дае падставу гаварыць аб папулярнасці гімназіі сярод насельніцтва краю. У 1860 годзе ў гімназіях Мінскай губерні навучалася 1667 чалавек, з іх 1284 (77%) складалі вучні каталіцкага веравызнання. З 322 вучняў Навагрудскай гімназіі ў 1861/1862 навучальным годзе да каталіцкага веравызнання належалі 274 вучні, да лютэранскага – 16, і толькі 29 – да праваслаўнага. На тэрыторыі Віленскай вучэбнай акругі склалася ўнікальная сітуацыя: большасць насельніцтва, звыш 70 %, былі праваслаўнымі, а амаль 100% культурнай і рэлігійнай эліты складалі каталікі. Сярэдні клас амаль на 100% складаўся з іўдзеяў. Колькасць

настаўнікаў, якія прыязджалі з рускіх губерняў, была невялікая і іх праца суправаджалася шэрагам складанасцей і праблем. Толькі адзінкі з іх супраціўляліся рэлігійнай і культурнай асіміляцыі і, адпрацаваўшы небходныя пасля ўніверсітэта 8 гадоў, пераязджалі ў іншыя рэгіёны, а большасць з іх бралі ў жонкі мясцовых шляхцянак і паступова асіміляваліся. Сярод тых, хто не пайшоў па «лёгкаму шляху», варта прыгадаць настаўніка рускай мовы М.А.Дзмітрыева. За амаль 10 гадоў педагагічнай працы на Навагрудчыне ён сабраў і сістэматызаваў шмат фальклорнага і этнаграфічнага матэрыялу Навагрудскага краю. Сабраныя матэрыялы ляглі ў аснову даследавання па гісторыі Навагрудчыны, якое атрымала высокую ацэнку Рускага геаграфічнага таварыства. Сам даследчык быў узнагароджаны сярэбраным медалём і атрымаў званне члена-карэспандэнта Рускага геаграфічнага таварыства.

Навагрудская гімназія размяшчалася ў гістарычным цэнтры горада – на тэрыторыі Малога замка (там, дзе зараз знаходзіцца помнік А.Міцкевічу). Будынкі засталіся ў спадчыну ад дваранскага пяцікласнага вучылішча і ўяўлялі сабой два мураваныя аднапавярховыя збудаванні, злучаныя паміж сабою драўляным пераходам. Тэрмін навучання ў гімназіі складаў 7 гадоў.

Паўстанне, што ўспыхнула на Літве і Польшчы ў 1863 – 1864 гадах, паказала, што насельніцтва тых зямель, якія былі далучаны ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, не жадае заспакойвацца. Нейкую частку віны за паўстанне ўсклалі і на сістэму адукацыі. Губернскія чыноўнікі палічылі, што пяць гімназій на тэрыторыі Віленскай вучэбнай акругі, гэта вельмі шмат. Жыццё паказала, што значная колькасць гімназістаў кінула вучобу і падалася ў паўстанцкія атрады.

Восенню 1861 года ў Навагрудскай гімназіі адбыўся пажар, агнём была пашкоджана вялікая плошча будынкаў. З-за рамонтных работ вучэбныя заняткі пачаліся толькі 15 верасня.

18 мая 1863 года з пасады дырэктара гімназіі быў вызвалены паляк Чашніцкі, афіцыйная падстава – пагаршэнне здароўя, а на самой справе – за ўдзел гімназістаў у паўстанні. Новым дырэктарам быў прызначаны М.В.Васільеў, які да таго часу займаў пасаду інспектара Мінскай гімназіі.

11 кастрычніка 1863 года настаўнік Навагрудскай гімназіі Н.А.Дзмітрыеў быў прызначаны ў Віленскую прагімназію інспектарам (у гімназіях пасада інспектара адпавядала пасадзе завуча, а ў прагімназіях – гэта была пасада кіраўніка). 15 жніўня 1864 года на хвалі барацьбы з рэшткамі паўстання Навагрудская гімназія была закрыта. На самой справе – гэта было часовае прыпыненне дзейнасці. Настаўнікі гімназіі не былі звольнены, а працягвалі атрымліваць заробак.

Паўторнае адкрыццё (аднаўленне дзейнасці) гімназіі адбылося 30 жніўня 1865 года, за месяц да гэтай падзеі ў Навагрудак вярнуўся МА.Дзмітрыеў і заняў пасаду дырэктара гімназіі. Цырымонія адкрыцця карэнным чынам адрознівалася ад той, што прайшла ў 1858 годзе. Як і ў 1858 годзе, урачыстае мерапрыемства было асвечана ў газеце. Адкрыццё пачалося з багаслужэння ў Мікалаеўскім саборы. На службе прысутнічалі ўсе вучні, у тым ліку і

каталіцкага веравызнання. Карэнным чынам змяніць сітуацыю з кантынгентам вучняў Дзмітрыеву не ўдалося, большасць па-ранейшаму складалі гімназісты з каталіцкіх сямей. Гэта прывяло да таго, што летам 1868 года Навагрудская гімназія была канчаткова закрыта. Дырэктар Навагрудскай гімназіі М.А.Дзітрыеў напярэдадні яе закрыцця быў пераведзены ў Гродна на пасаду дырэктара народных вучылішч. У Віленскай вучэбнай акрузе адным указам з Навагрудскай былі зачынены гімназіі: Тэльшэўская, Панявежская, Кейданаўская.

## Навагрудская беларуская прыватная гімназія

Прыватная навагрудская гімназія з руска-беларускай мовай навучання пры садзейнічанні бацькоўскага камітэту была адкрыта ў горадзе ў 1919 годзе. Навагрудак у гэтай справе не быў лідарам. Першая гімназія адчыніла дзверы ў Слуцку ў 1917 годзе, другая – у Будславе ў 1918 годзе, трэцяя – у Вільні, і толькі чацвёртая – у Навагрудку. Нацыянальнае абуджэнне, што прынесла народам Расійскай імперыі Кастрычніцкая рэвалюцыя не абмінула і Беларусь. У адкрытай у 1919 годзе ў Навагрудку школе навучанне напачатку вялося на рускай мове, а ўжо ў 1921 годзе быў адкрыты першы беларускамоўны клас.

Па ўмовах Рыжскай мірнай дамовы Заходняя Беларусь плошчай 10 тысяч км квадратных з насельніцтвам 4,5 млн.чалавек (таксама і Навагрудчына) апынулася ў складзе адноўленай Рэчы Паспалітай. Навагрудак стаў цэнтрам аднаго з пяці новых ваяводстваў.

Уласнага будынка гімназія не мела і арэндавала памяшканне – другі паверх двухпавярховага будынка ў Шмуйлы Ізраэліта. Дом Шмуйлы размяшчаўся на рагу Рыначнай плошчы побач з гасцінніцай «Еўропа». Плата за арэнду была высокай – 300 злотых за месяц. Разлічвацца з гаспадаром будынка кожны раз было цяжэй і цяжэй, нягледзячы на тое, што на гэтыя мэты ішлі не толькі сродкі ад аплаты за вучобу, але і дапамога гімназіі з розных крыніц: ахвяраванні на школу ад мясцовых жыхароў і дапамога ад навагрудчан-эмігрантаў з ЗША. Зыходзячы з такіх варункаў, бацькоўскі камітэт прыняў рашэнне будаваць новы будынак пад школу. Участак пад будаўніцтва быў выдзелены ў 1926 годзе, праект быдынка зрабілі выпускнікі, што вучыліся ў Чэхіі. Старэйшыя вучні гімназіі актыўна працавалі ў вольны ад заняткаў час на работах па ўзвядзенні падмурка.У цырымоніі закладкі першага каменя 19 верасня 1929 года прымаў удзел прэзідэнт Другой Польскай Рэспублікі Ігнацій Масціцкі, які ахвяраваў на будаўніцтва 3000 злотых. Будоўлю асвяціў праваслаўны епіскап Аляксей. Пазней, дзякуючы настойлівасці дэпутатаў парламента, ад беларускіх ваяводстваў на будоўлю гімназіі з дзяржаўнага бюджэту было выдзелена 300 тысяч злотых. Навагрудчане, што аселі ў Амерыцы, прыслалі на гэтыя мэты 16 тысяч даляраў. Работы па ўзвядзенні будынка ішлі шпаркімі тэмпамі.

Навучанне ў гімназіі было платным. Памер аплаты залежаў ад класа:1 клас – 8 злотых, 2 клас – 10 злотых, 3 клас – 12 злотых, 8 клас – 22 злотыя за

месяц. Частка вучняў з бедных сямей ад аплаты часткова ці поўнасцю вызвалялася.

На першым этапе існавання гімназіі ў вучэбнай дзейнасці рэалізоўваўся гуманітарны накірунак, пазней – прыродазнаўчы. Большая частка класаў гімназіі займалася ў другую змену, бо ў першую вучыліся дзеці яўрэйскай школы. У гімназіі вывучалі мовы: польскую, беларусую, рускую, нямецкую, лацінскую (факультатыўна). Атрымоўвалі веды па матэматыцы, гісторыі, геаграфіі, фізіцы, хіміі, рэлігіі. Да 1923 года склад вучняў быў «інтэрнацыянальны». У 1923 годзе выйшла забарона на прыём ва ўстанову яўрэйскіх дзяцей, гімназія амаль на 100% становіцца беларускай. У 1923/1924 навучальным годзе тут навучалася 250 чалавек. Першы выпуск гімназістаў адбыўся ў 1928/1929 навучальным годзе. Экзамены на атэстат сталасці (матуру) здавалі першыя выпускнікі (4 чалавекі), яшчэ 2 выпускнікі здавалі экзамены экстэрнам.

У гімназіі працавала некалькі бурсаў (інтэрнатаў) для пражывання вучняў. Бурсы знаходзіліся ў г. Навагрудку на вул. Валеўскай, на вул. Паштовай (у хаце Ваўчка), на вул. Сянежыцкай (за Сакольскім спартовым пляцам) і ў в. Брацянка Навагрудскага р-на.

Тыя вучні, што пражывалі ў бурсе, штомесяц павінны былі здаваць тры злотыя на цукар, гарбату і наступную колькасць прадуктаў для арганізацыі харчавання: бульбу (2 пуды), муку аржаную (1,5 пуды), крупы (10 фунтаў), муку пшанічную (10 фунтаў), сала (2 кг). Зусім бедных студэнтаў ад здачы прадуктаў вызвалялі.

У гімназіі вялікая ўвага надавалася фізічнаму выхаванню. Каманды гімназістаў удзельнічалі ў шматлікіх спаборніцтвах. Адметнасцю гімназіі была мастацкая самадзейнасць. Тут дзейнічаў хор і аркестр, якімі паспяхова кіраваў кампазітар А.Валынчык, працаваў драматычны гурток, удзельнікі якога паставілі не адзін дзясятак спектакляў, у тым ліку на платнай аснове. Вучні гімназіі складалі слоўнік па творах Ядвігіна Ш. (А. Лявіцкага), выдаваўся гімназічны часопіс «Жаваранак». У навучальнай установе вялася вялікая работа па збору гербарыя мясцовай флоры, вучнямі і настаўнікамі быў пасаджаны гарадскі парк. Не абыйшоў гімназію і ўплыў падпольных камуністычных арганізацый Заходняй Беларусі. Уплыў КСЗМБ быў даволі моцны. Супрацоўнікамі дыфензівы былі выкрыты актыўныя ўдзельнікі падпольнага руху з ліку гімназістаў і адзін вучань па рашэнні суда быў пакараны смерцю праз павешанне, а другія атрымалі вялікія тэрміны турэмнага зняволення.

Створаная Пяцэвічам, Акулікам, Амельяновічам Навагрудская беларуская гімназія прайшла складаны шлях. 15 гадоў працы ў дзяржаве, якая не прызнавала само існаванне беларускай нацыі – гэта подзвіг. Кіраўнікамі гімназіі былі: Пяцэвіч (1919-1921гг.), Ян Цеханоўскі (1921-1924гг.), Пётр Скрабец (1924- 1927гг.), Ян Цеханоўскі (1927-1934 гг.).

За час існавання гімназіі тут працавала 42 педагогі, якія, нягледзечы на невысокую заработную плату, аддана служылі сваёй справе, шчодра дзяліліся сваімі ведамі з сялянскімі дзецьмі. Вялікі ўклад у развіццё гімназіі і

светлы след у жыцці сваіх вучняў пакінулі: Ян Цеханоўскі, Пётр Скрабец, Міхаіл Чатырка, Аляксей Данілевіч, Язэп Драздовіч, Аляксандр Орса, Аляксандр Шумскі і многія іншыя. За перыяд існавання Навагрудскай беларускай гімназіі ў ёй навучалася 469 дзяцей. Пераважная большасць з іх здолела закончыць поўны курс і атрымаць сярэднюю адукацыю, а многія атрымалі вышэйшую адукацыю і прынеслі славу сваёй школе. Сярод іх – Леанід Барысаглебскі, які стаў прафесарам БДУ, Аркадзь Лазаровіч – настаўнік Валеўскай школы (па яго ініцыятыве ў школе быў створаны дэндрарый), Ніна Тарас – вядомая беларуская паэтэса і дзясяткі другіх.

Ганенні на беларускую мову, рэпрэсіі супраць беларускай нацыянальнай інтэлегенцыі не абмінулі і Навагрудскую гімназію. Прынятце ў Другой Польскай Рэспубліке законаў «Аб арганізацыі школьнай справы» і «Аб прыватных школах і выхаваўчых установах» зрабілі патрабаванні да прыватных школ, асабліва ў плане матэрыяльнай дапамогі, вельмі жорсткімі. У 1932 годзе Навагрудская прыватная гімназія стала філіялам Навагрудскай польскай гімназіі імя А.Міцкевіча, а ў 1934 годзе філіял быў ліквідаваны. Пераважная часка вучняў закрытай Навагрудскай гімназіі, дзякуючы старанням колішняга выпускніка, а пазней выкладчыка Віленскай беларускай гімназіі, прадоўжыла навучанне ў Вільні. Другая частка прадоўжыла сваё навучанне ў Навагрудскай польскай гімназіі.

Пасля далучэння ў 1939 годзе Заходняй Беларусі да БССР, савецкай уладай было прынята рашэнне аб адкрыцці ў Навагрудку беларускай гімназіі. Установе быў вернуты будынак, які ўзводзіўся па ініцыятыве бацькоўскага камітэта, але ў якім ні аднаго дня гімназія не працавала. Навагрудскія дзеці, што навучаліся ў Віленскай гімназіі, на чале з Барысам Кітам у вельмі сціслыя тэрміны пераехалі ў Навагрудак і пачалі працу. Колькасць вучняў гімназіі хутка дасягнула 1000. Пры гімназіі працавала сямігодка, заняткі якой былі арганізаваны ў другую і ў трэцюю змены. Плённую працу гімназіі перарвала Вялікая Айчынная вайна. У гэты перыяд гімназію ўзначальвалі: Барыс Кіт (1939 – 1940гг.), Фелікс Баржэмскі (1940 – 1941гг.). Сярод выклачыкаў гімназіі ў гэты час выдзяляюцца Л.Барысаглебскі і Э.Залкінд.

Ёсць звесткі, што ў гады вайны ва ўмовах фашысцкай акупацыі ў Навагрудку працавала прагімназія, дырэктарам якой быў Родзька. Аднак аўтар не валодае інфармацыяй аб яе лакалізацыі. Дакладна вядома, што ў 1943 – 1944гг. у будынку гімназіі размяшчалася Навагрудская настаўніцкая семінарыя. З пасляваеннага часу і да цяперашняга перыяду ў будынку былой гімназіі размяшчаецца СШ №1 горада Навагрудка.

Памяць аб гімназіі і людзях, што ў ёй працавалі, увасобілася ў цяністых алеях гарадскога парка, спланаванага і пасаджанага вучнямі і настаўнікамі, у будынку СШ №1 горада Навагрудка, узведзенага бацькоўскім камітэтам для дзяцей Навагрудскага краю, у назве вуліцы Язэпа Драздовіча, былога выкладчыка гімназіі, беларускага мастака, этнографа.

## Навагрудская польская гімназія імя А.Міцкевіча

У 1905 годзе пад уплывам падзей першай рускай рэвалюцыі ў Маніфесце 17 кастрычніка было зацверджана права нетытульных народаў Расійскай імперыі на вывучэнне ў школах роднай мовы. Гэта закранула і палякаў, што пражывалі ў заходніх губернях краіны пасля падзелаў РП. Польская мова пасля паўстанняў са школ выціскалася і канчаткова была забаронена пасля студзеньскага паўстання 1863 года.

Першая спроба адкрыць польскую школу на Навагрудчыне была здзейснена Марыяй Вяжбоўскай – гэта была прыватная школа. Аднак у 1912 годзе яна была зачынена. У 1915 годзе пасля акупацыі Навагрудчыны войскамі кайзераўскай Германіі дзейнасць школы была адноўлена. Яе кіраўніком была М. Вяжбоўская. У 1916 годзе ў польскай школе быў адкрыты гімназічны клас. Размяшчалася навучальная ўстанова на вуліцы Валеўскай у доме Лейтнекера (пазней, у пасляваенны час, у гэтым будынку знаходзілася да 1973г. школа-інтэрнат для глуханямых дзяцей, а з 1973 па 2017г. – Дом піянераў). Зараз гэты будынак знаходзіцца на вуліцы Леніна, д. 59. Настаўнікамі ў школе працавалі: Юзэфа Вярцінская, Казімір Кярсноўскі, Яраслаў Казлоўскі, Станіслаў Міхневіч, Юзэф Грабоўскі, Караль Лазінскі. К.Лазінскі стаў першым дырэктарам польскай гімназіі, што была арганізавана ў 1918 годзе. Не ўдаючыся ў перыпетыі падзей, што імкліва прамільгнулі на Навагрудчыне ў 1918 – 1919 гадах, скажам, што дзейнасць гімназіі спынялася з прыходам савецкай улады і аднаўлялася пасля акупацыі польскімі войскамі. Пасля чарговага аднаўлення польская гімназія пачала сваю работу ў 1919 годзе ў будынку былога езуіцкага кляштара па вуліцы Карэліцкай, д.7. Паводле Рыжскай мірнай дамовы ад 18 сакавіка 1921 года Заходняя Беларусь увайшла ў склад Другой Польскай Рэспублікі, а 20 красавіка 1921 года быў падцверджаны статус польскай гімназіі як прыватнай навучальнай установы. Але ўжо 3 жніўня 1921 года гімназія атрымала статус дзяржаўнай. Навучальная ўстанова складалася з сямі класаў. У першы год у гімназіі навучалася 300 вучняў. У розныя гады тут атрымлівалі веды ад 290 да 436 дзяцей. 21 лютага 1922 года гімназіі было афіцыйна прысвоена імя А. Міцкевіча.

Першым дырэктарам дзяржаўнай польскай гімназіі быў ксёнз Фабіян Абрантовіч. Пазней яе ўзначальвалі: М. Глямбіцкі, Я. Бычынскі, Я. Баньскі, В. Віткоўскі, Ю. Рубіцкі, С. Пазняк. У гімназіі была створана харцэрская дружына імя Т. Касцюшкі. Сіламі выкладчыкаў і вучняў выдавалася гімназічная газета «Наша жыццё».

У 1937 годзе пасля ўвядзення ў Польшчы трохступеньчатай адукацыі (6-класная пачатковая школа, 4-класная гімназія, 2-класны ліцэй) была праведзена рэарганізацыя і гімназія атрымала назву: «Дзяржаўны ліцэй-гімназія № 919 у Навагрудку».

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 года ў Навагрудку непрацяглы час працавала польская сярэдняя школа.

Навучанне ў польскай гімназіі было платным. Толькі ўступны ўзнос у 1931/1932 навучальным годзе складаў 223 злотых (у той час карова

каштавала 80 – 100 злотых, конь – 120 – 150 злотых). Польская гімназія ў першую чаргу была разлічана на дзяцей дзяржаўных служачых, настаўнікаў, асаднікаў. Для гэтых катэгорый існаваў шэраг льгот, адной з якіх было поўнае вызваленне ад платы. Доля беларусаў сярод навучэнцаў польскай гімназіі была мізэрнай і ніякіх льгот яны не мелі. Заняткі ў польскай гімназіі пачыналіся 1 верасня і працягваліся да канца чэрвеня. Ва ўстанове выкладаліся наступныя прадметы: польская мова, нямецкая мова, лацінская мова, прыродазнаўства, фізіка, гісторыя, рэлігія, гімнастыка, спевы, матэматыка, гігіена, ваенная падрыхтоўка.

Усе вучні павінны былі насіць гімназічную форму. Для хлопчыкаў гэта былі штаны і мундзір цёмна-сіняга колеру, шапка з эмблемай, падобная на капялюш, на рукаве мундзіра быў шэўрон з сімволікай гімназіі. Для дзяўчынак – спадніца ў складку, блузка з доўгімі рукавамі.

Да мая 1922 года Навагрудскае ваяводства было самастойнай школьнай акругай. Пазней, пасля мая 1922 года, тэрыторыя ваяводства была падзелена на Баранавіцкі, Нясвіжскі, Стаўбцоўскі паветы, якія адышлі да Палескай вучэбнай акругі; Лідскі, Навагрудскі, Слонімскі, Валожынскі – да Беластоцкай. Яшчэ пазней Навагрудскі павет адышоў да Віленскай вучэбнай акругі.

Структура кіравання адукацыяй на ўзроўні павета ўключала ў сябе школьную раду, якую ўзначальваў школьны інспектар. У Навагрудскім ваяводстве было 7 інспектараў, прычым адна з іх жанчына.

На тэрыторыі Навагрудскага ваяводства, па стану на 1924 год, налічвалася 962 пачатковыя школы, у якіх навучалася 71 400 дзяцей. Большасць з гэтых школ былі адна – двухкласнымі і толькі 27 – сямігадовымі. У Навагрудскім павеце было 110 школ і толькі 2 сямікласныя. У школах Навагрудскага ваяводства працавала 1436 настаўнікаў: 757 мужчын і 679 жанчын. Кваліфікаваных настаўнікаў, што мелі педагагічную адукацыю, было толькі 24%.

У польскай гімназіі панавалі даволі жорсткія парадкі. Калі вучань па якіх-небудзь прычынах не мог прыйсці на заняткі, то ён у той жа дзень павінен быў паведаміць пра гэта класнаму настаўніку. Пры адсутнасці без уважлівых прычын больш васьмі дзён вучня адлічвалі з гімназіі. Пасля 20.00 гадзін навучэнцы польскай гімназіі не мелі права знаходзіцца на вуліцы. Пасля 17 верасня 1939 года польская гімназія спыніла сваё існаванне.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў Навагрудку працавала польская сямікласная школа, што месцілася ў памяшканні пачатковай польскай школы сясцёр Назарэцянак па вуліцы 1 Мая.

## Гімназія № 1 горада Навагрудка

Прыняты 29 кастрычніка 1991 года Закон «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» даваў магчымасць ствараць новыя тыпы навучальных устаноў: гімназіі, ліцэі, школы ці класы з паглыбленым вывучэннем асобных прадметаў. Парадак залічэння вучняў у гімназіі і ліцэі рэгламентаваўся «Прыкладным палажэннем аб гімназіі і ліцэі» ад 15 ліпеня 1992 года.

Палажэнне прадугледжвала  конкурсны набор вучняў. Якім будзе прахадны бал вырашаў савет установы.

Ужо ў 1994 годзе  ў РБ пачаўся эксперымент па стварэнні мадэлей профільных класаў у сельскіх школах. У якасці пляцоўкі для эксперыменту быў абраны Глыбоцкі раён Віцебскай вобласці. У 1995 годзе Міністэрствам адукацыі РБ былі распрацаваны вучэбныя планы для базавага, павышанага і паглыбленага ўзроўню вывучэння прадметаў з рознай колькасцю гадзін. Гэты дакумент замацаваў юрыдычную аснову існавання профільных класаў у школах рэспублікі. Названыя новаўвядзенні  паскорылі асэнсаванне неабходнасці  рэформ у сферы адукацыі і вызначылі  іх асноўныя накірункі.

У 1996 годзе была створана на ўзроўні Міністэрства адукацыі спецыяльная рабочая група па распрацоўцы канцэпцыі  рэформы сярэдняй школы. Групай былі абазначаны наступныя кірункі рэфармавання:

1. Пераход да абавязковай дзесяцігадовай базавай адукацыі.
2. Пераход да  дванаццацігадовай сярэдняй школы.
3. Арганізацыя профільнага навучання ў 10 – 12 класах.
4. Выкарыстанне новых педагагічных тэхналогій у вучэбным працэсе.

Пасля двухгадовай апрабацыі  ва ўмовах эксперыменту і шырокага абмеркавання, найперш у педагагічных калектывах, адукацыйная рэформа стартавала. 1998 год стаў пачаткам рэформы Стражава (В. І. Стражаў – міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1994–2001 гг.). Планавалася завяршыць новаўвядзенні ў 2008 годзе, калі адбудзецца першы выпуск 12 гадовай школы.

Важнымі этапамі рэформы варта разглядаць:

1. Пераход на пяцідзённы вучэбны і шасцідзённы рабочы тыдзень (1998г.).
2. Пераход на дзесяцібальную сістэму ацэнкі ведаў (2002г.).
3. Змяненне правіл паступлення ў ВНУ, увядзенне цэнтралізаванага тэставання (ЦТ) (2003г).
4. Пачатак прыёму ў ліцэі з 8 класа.

Першага выпуску дванаццацігадовай школы не адбылося. 12 ліпеня 2008 года быў падпісаны Дэкрэт Прэзідэнта РБ № 15 «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі», які скасаваў некаторыя палажэнні рэформы, а іменна: вярнуў тэрмін навучання на ўзроўні базавай адукцыі да 9 гадоў, а сярэдняй – да 11 гадоў, скасаваў прафілізацыю і вярнуў у школу прафесійную падрыхтоўку (на трэцяй ступені).

Пачынаючы з 2011 года прыём у гімназіі рэгулюецца  «Палажэннем аб установе сярэдняй адукацыі», у якім прапісваецца форма правядзення экзаменаў (пісьмовая), іх колькасць і час правядзення. Заданні да ўступных экзаменаў дасылаліся  Упраўленнямі адукацыі аблвыканкамаў.

У 2015 годзе на змену профільным прыходзяць гімназіі з накірункамі ў рабоце, а з 2018 года гімназіі канчаткова перастаюць быць элітнымі ўстановамі, адмяняюцца ўступныя экзамены.

Адкрыццё гімназіі ў Навагрудку не было спантаным крокам. Яшчэ за год да гэтай падзеі паводле Рашэння Навагрудкага РВК №491 ад 15.10.2002 года былі адкрыты:

а) ліцэйскія класы: у СШ № 4 – 10 клас, у СШ № 6 – 10 клас грамадска-эканамічнага профілю, у СШ № 7 – клас ваенна-патрыятычнага профілю;

б) гімназічныя класы: у СШ № 3 – 4 клас, у СШ № 5 – 4 клас, у СШ № 6 – 4 клас, у Любчанскай СШ – 4 клас.

У 2003 годзе Навагрудскім РВК было прынята рашэнне №303 ад 10.06.2003 года «Аб рэарганізацыі СШ №1 г. Навагрудка ў гімназію №1 г.Навагрудка». Чым быў абумоўлены факт выбару СШ №6, сказаць цяжка. На першы погляд у горадзе працавала СШ №1, што размяшчалася ў будынку, які будаваўся бацькоўскім камітэтам у міжваенны час для Навагрудскай беларускай гімназіі, дзе яна знаходзілася ў 1939 – 1941 гадах. Магчыма, ролю адыгралі тры фактары:

1. Адсутнасць каналізацыі і ўнутранных санітарных блокаў у будынку СШ №1.

2. Адсутнасць харчблока ў СШ № 1 (харчаванне вучняў было на той час прывазное).

3. Неперспектыўнасць мікрараёна СШ № 1 (мікраараён СШ № 1 – гэта прыватная забудова).

Але гэта толькі меркаванні аўтара. Калі разглядаць створаную гімназію паводле крытэрыя «класічная» і «не класічная», то, безумоўна, гэта была некласічная гімназія, бо ва ўстанове заставалася пачатковая школа. І гэта было не выключэнне. Большасць гімназій у краіне працавала з пачатковымі класамі. З аднаго боку гэта давала магчымасць рабіць пэўны адбор лепшых вучняў для паступлення ў гімназію і рабіла для гэтай часткі вучняў пераход з першай ступені навучання на другую менш балючым, а з другога боку – звужвала магчымасці паступлення ў гімназію для дзяцей з іншых мікраараёнаў (іншых школ) і неафіцыйна замацоўваў гімназію за пэўным мікраараёнам.

Поруч з адкрыццём гімназіі ў Навагрудскім раёне штогод працягваецца практыка адкрыцця новых ліцэйскіх і гімназічных класаў. Мяркуйце самі: у 2003/2004 навучальным годзе ліцэйскія класы былі адкрыты: у СШ № 4 – 10, 11 класы грамадска-эканамічнага профілю; у СШ № 5 – 10, 11 класы хіміка-біялагічнага профілю; у СШ № 7 – 10, 11 класы ваенна-патрыятычнага прфілю; пачалі дзейнасць гімназічныя класы: СШ № 2 – 4 «А» клас, СШ № 3 – 4 «Г» клас, СШ № 4 – 4 «Г», 5 «Г» класы, СШ № 7 – 4 «Б», 5 «Б» класы, Любчанская СШ – 4 «Б», 5 «Б» класы.

З 1 верасня 2003 года ў гімназіі № 1 г. Навагрудка рашэннем РВК №531 ад 28.10.2003 г.былі ўведзены две стаўкі вызваленага класнага кіраўніка.

Нягледзечы на адкрыццё гімназіі, практыка акрыцця новых ліцэйскіх і гімназічных класаў была прадоўжана і ў наступныя гады. Так, паводле рашэння Навагрудскага РВК №627 ад 19.10.2004 года былі адкрыты ліцэйскія класы: у СШ № 1 – 10 «А» клас з аграрэхнічным профілем, у СШ № 4 – 10 «А» клас з лінгвістычна-матэматычным профілем, 11 «А» клас з

грамадска- эканамічным профілем; у СШ № 7 – 10 «К» і 11 «К» класы з ваенна-патрыятычным профілем; у Любчанскай СШ – 10 клас з агратэхнічным профілем; у гімназіі № 1 – 10 «А» і 11 «А» класы з грамадска-эканамічным прфілем, 10 «Б» і 11 «Б» класы з гуманітарным профілем.

Дзейнічалі гімназічныя класы: у СШ № 2 – 6 «А»; у СШ № 3 – 6 «А», 7 «А»; у СШ № 4 – 6 «А»; у СШ № 5 – 6 «Г», 7 «Г»; у гімназіі № 1 – 5 «А», 5 «Б», 6 «А», 6 «Б», 7 «Г», 8 «А», 8 «Б», 9 «Б»; у СШ № 7 – 5 «Б», 6 «Б»; у Любчанскай СШ – 5, 6 «Б», 7 «Б», 8 «Б».

Ужо ў 2005/2006 навучальным годзе ў гімназіі № 1 працуюць 15 гімназічных класаў: 5 «А», 5 «Б», 6 «А», 6 «Б», 6 «В», 7 «А», 7 «Б», 8 «А», 8 «Б», 9 «А», 9 «Б», 10 «А», 10 «Б», 11 «А», 11 «Б». Такая ж колькасць працуе ў іншых школах раёна: СШ № 2 – 7 «А», СШ № 3 – 7 «А», 8 «А», СШ № 4 – 7 «А», СШ № 5 – 7 «Г», 8 «Г», СШ № 7 – 5 «А», 6 «Б», 7 «Б», 8 «Г», Любчанская СШ – 6, 7 «Б», 8 «Б», 9 «Б»; Нягневіцкая СШ – 5 «А».

Паводле рашэння Навагрудскага РВК №590 ад 27.09.2005 года пашыралася сетка ліцэйскіх класаў. У 2005/2006 навучальным годзе яны працавалі ва ўстановах адукацыі: у СШ № 1 – 10 «А» гуманітарнага профілю; у СШ № 4 – 10 «Б» грамадска-эканамічнага профілю, 11 «А» лінгвістычна-матэматычнага профілю; у Любчанскай СШ – 11 клас – ліцэйская група агратэхнічнага профілю.

З мэтай прыцягнення найбольш кваліфікаваных педагагічных работнікаў для работы з высокаматываванымі вучнямі праводзілася працэдура конкурснага адбору. Улічваючы высокі адукацыйны і катэгарыйны патэнцыял настаўнікаў гімназіі гэтая працэдура насіла досыць фармальны характар. Разам з тым, першы конкурсны адбор, мэтай якога было выключэнне субектыўнага падыходу, праходзіў у кабінеце старшыні райвыканкама А.В.Ліса.

З першых дзён свайго існавання гімназія № 1 заняла лідзіруючыя пазіцыі ў адукацыйнай прасторы раёна, вялікая заслуга ў гэтым настанікаў .

Па стану на 01.10.2010 года ў гімназіі № 1 працавала 58 педагогаў. Вышэйшую адукацыю мелі 56 з іх (96%), сярэднюю спецыяльную – 2 (4%). Вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю мелі 34 педагагічныя работнікі (59%), і гэта быў самы высокі паказчык у раёне. Першую катэгорыю мелі 11 педагагічных работнікаў (19 %), другую – 2 (3%), без катэгорыі – 11 (19%). Такое становішча з кадрамі не было выключэннем аднаго навучальнага года, а з’яўляецца характэрнай асаблівасцю гімназіі. Так, у 2013/2014 навучальным годзе ў гімназіі працаваў 61 педагагічны работнік, 57 з іх мелі вышэйшую адукацыю (93,44%), сярэднюю спецыяльную – 4 (6,6%). Вышэйшую катэгорыю мела 35 педагагічных работнікаў (57,38%), першую – 7 (11%), другую – 2 (3 %), без катэгорыі – 11 (19%).

Па стажу работы: да 5 гадоў – 14 (22,95%); ад 5 да 10 гадоў – 3 (4,9%);

- ад 10 да 15 гадоў – 3 (4,9%); звыш 15 гадоў – 41 (67,2%).

Другой адметнасцю гімназіі №1 з’яляецца высокая канкурэнтнасць яе выпускнікоў. Ва ўстановы вышэйшай адукацыі паступілі: 2008 г. – 32

выпускнікі (86,5%); 2009 г. – 43 выпускнікі (86%); 2010 г. – 22 выпускнікі (67%); 2011 г. – 39 выпускнікоў (91%); 2012 г. – 25 выпускнікоў (81%).

Сярэдні бал паспяховасці гімназістаў заўсёды быў адным з самых высокіх у раёне: 2009/2010 навучальны год – 7,96; 2010/2011 навучальны год – 8,41; 2011/2012 навучальны год – 8,44; 2012/2013 навучальны год – 8,36.

Выніковасць удзелу гімназістаў у прадметных алімпіядах уражвае:

а) раённы этап: 2008/2009 навучальны год – 24 дыпломы (усяго па раёну – 98); 2009/2010 навучальны год – 10 дыпломаў (па раёну – 57); 2010/2011 навучальны год – 12 дыпломаў (па раёну – 64); 2011/2012 навучальны год – 16 дыпломаў (па раёну – 94); 2012/2013 навучальны год – 22 дыпломы ( па раёну – 93);

б) абласны этап: 2008/2009 навучальны год – 2 (усяго па раёну 11); 2009/2010 навучальны год – 3 (усяго па раёну – 8); 2010/2011 навучальны год – 4 (усяго па раёну – 8); 2011/2012 навучальны год – 4 (усяго па раёну – 14); 2012/2013 навучальны год – 1 (усяго па раёну – 5);

в) рэспубліканскі ўзровень: 2008/2009 навучальны год – 0 (усяго па раёну – 0); 2009/2010 навучальны год – 0 (усяго па раёну – 1); 2010/2011 навучальны год – 0 (усяго па раёну – 1); 2011/2012 навучальны год – 1 (усяго па раёну – 1); 2012/2013 навучальны год – 0 (усяго па раёну – 0).

За час існавання гімназіі колькасць вучняў ніколі не была менш 550 чалавек, з іх прыкладна палову складалі вучні пачатковых класаў. У 2009/2010 навучальным годзе ў 5 – 11 класах – 318 вучняў; у 2010/2011 навучальным годзе ва ўстанове навучаўся 591 вучань, з іх 332 – у 5 – 11 класах; у 2022/23 навучальным годзе – 724 вучні, з іх у 5 – 11 класах – 364 вучні. За перыяд 2005 – 2010 гады 30 (15,5%) выпускнікоў гімназіі №1 атрымалі залатыя і сярэбраныя медалі.

За перыяд існавання гімназіі № 1 яе ўзначальвалі: Мароз Таццяна Георгіеўна (2003 – 2005 гг.), Вайтовіч Наталля Міхайлаўна (2005 – 2013гг.), з 2013 года Аляхновіч Святлана Міхайлаўна з'яўляецца дырэктарам.

Імідж гімназіі ствараюць не толькі выпускнікі, але і педагогі. Сярод тых, хто пакінуў добры след у душах выпускнікоў: Мароз Таццяна Георгіеўна, Новік Галіна Казіміраўна, Малуха, Сарока.

## Гімназія № 2 горада Навагрудка

У пасляваенны час у Навагрудку і раёне было створана некалькі ўстаноў адукацыі для дзяцей сірот, дзяцей-інвалідаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Гэта першы і другі дзіцячыя дамы, Адампальскі дзіцячы дом, а з 1960 года – Навагрудская школа-інтэрнат. Кожная з гэтых устаноў на пэўным этапе выконвала ўскладзеныя на яе задачы, а праз некаторы час закрывалася ці рэарганізоўвалася. Так было з дзіцячым домам № 1, які быў зачынены ў 1970 годзе, а на яго базе быў адчынены дзіцячы сад № 5. Так было з Адампальскім дзіцячым домам, які быў рэарганізаваны ў школу-інтэрнат, а ў 1991 годзе – у Навагрудскую школу-інтэрнат для дзяцей з адхіленнямі ў паводзінах, у сем'ях якіх неспрыяльныя ўмовы для жыцця. З 01.09.2007 года дадзеная ўстанова была рэарганізавана ў школу-інтэрнат для

таленавітых і адораных дзяцей. Калектывам школы была праведзена вялікая работа па вываду і ўладкаванні выхаванцаў школы-інтэрната і набору высокаматываваных вучняў. За парты села 112 такіх вучняў. Гэта была яшчэ не гімназія, але вучэбны план, па якім пачала працу ўстанова, быў гімназічны. Ужо 01.01.2008 года рашэннем Навагрудскага РВК №337 школа-інтэрнат для таленавітых і адораных дзяцей была рэарганізавана ў «Гімназію №2 г.Навагрудка». Пачаўся пакручасты і складаны шлях пошуку свайго месца ў адукацыйнай прасторы раёна ўстановай, якая з першых дзён стала канкурэнтам гімназіі №1 г.Навагрудка.

У 2010 годзе ў гімназіі № 2 працавала 32 педагагічныя работнікі. Вышэйшую адукацыю меў 31 (97%) з іх, гэта лепшы паказчык у раёне. Сярэдюю спецыяльную адукацыю – 1 (3%). Вышэйшую катэгорыю мелі 13 работнікаў (41%), першую – 11 (33%), другую – 4 (13%), без катэгорыі – 4 (13%). У прышкольным інтэрнаце пражывала 86 дзяцей, 63 з іх – гімназісты (вучні 5 – 11 класаў).

У 2013/2014 навучальным годзе працавала 40 педагагічных работнікаў, 39 (97,5%) з іх мела вышэйшую адукацыю, сярэднюю спецыяльную – 1 (2,5%). Вышэйшую катэгорыю мела 17 педагогаў (42,5%), першую – 11 (27,5%), другую – 7 (17,5%), без катэгорыі – 5 (12,5%). У гімназіі №2 навучалася 240 дзяцей,70 з якіх – у пачатковых класах.

Педработнікі паводле стажу працы падзяляліся: да 5 гадоў – 6 чалавек, ад 5 да 10 гадоў – 8 чалавек, ад 10 да 15 гадоў – 5, звыш 15 гадоў – 24.

Паступленнне выпускнікоў гімназіі №2 у вышэйшыя навучальныя ўстановы было значна ніжэйшым, чым у гімназіі №1 і па гадах складала: 2008г. – 9 выпускнікоў (60%), 2009г. – 15 выпускнікоў (45%), 2010г. – 11 выпускнікоў (42%), 2011г. – 13 выпускнікоў (59%), 2012г. – 27 выпускнікоў (75%).

Паспяховасць вучняў гімназіі №2 была заўсёды на 2 – 3 месцы ў раёне. Сярэдні бал па ўстанове складаў: 2009/2010 навучальны год – 7,68 бала; 2010/2011 навучальны год – 8,06 бала; 2011/2012 навучальны год – 8,3 бала; 2012/2013 навучальны год – 8,16 бала.

Удзел вучняў у прадметных алімпіядах меў наступныя вынікі:

а) на другім (раённым) этапе: 2008/2009 навучальны год – 3 дыпломы з 98; 2009/2010 навучальны год – 3 дыпломы з 57; 2010/2011 навучальны год – 6 дыпломаў з 64; 2011/2012 навучальны год – 15 дыпломаў з 94; 2012/2013 навучальны год – 11 дыпломаў з 93;

б) на трэцім (абласным ) этапе: 2008/2009 навучальны год – 0 з 11, што атрымалі вучні раёна; 2009/2010 навучальны год – 1 дыплом з 8; 2010/2011 навучальны год – 1 дыплом з 8; 2011/2012 навучальны год – 0 дыпломаў з 14; 2012/2013 навучальны год – 0 дыпломаў з 5.

в) на чацвёртым (рэспубліканскім) этапе за разглядаемы прамежак часу дыпломаў не было заваявана.

Наяўнасць прышкольнага інтэрната давала магчымасць гімназіі № 2 прыцягваць ва ўстанову дзяцей не толькі з сельскай мясцовасці Навагрудскага раёна, але і з-за яго межаў. Уступныя экзамены кожны год

здавалі 20 – 25 прэтэндэнтаў. У 2013 годзе паступіла ў гімназію 18 чалавек. Толькі адзін з іх на трох экзаменах набраў 30 балаў з 30. З улікам гадавых адзнак у 10 вучняў з паступіўшых агульны сярэдні бал складаў 50 балаў. Самы высокі – 57 балаў. У астатніх 8 гімназістаў, што прайшлі па конкурсу, агульны бал быў ад 50 да 44.

Кіраўнікамі гімназіі № 2 г.Навагрудка былі: Анікевіч Алег Аркадзьевіч – з 01.01.2008г. па 18.04.2008г.; Гарэлік Аксана Генадзьеўна – з 19.04.2008г. па 01.09.2016г. З 01.09.2016 гімназія № 2 г. Навагрудка была рэарганізавана ў СШ № 8, а з 01.09.2017 была зачынена.

## Нягневіцкая гімназія

Гісторыя гэтай навучальнай установы кароткая. Яна пачалася ў 2006 годзе і доўжылася да 2011 года. Адзіным кіраўніком была Гаўрылкевіч Марыя Аляксандраўна.

У 2010 годзе ў Нягневіцкай гімназіі працавала 32 педагагічныя работнікі. Вышэйшую адукацыю мелі 27 (84%), сярэднюю спецыяльную – 5 (16%), вышэйшую катэгорыю – 7 (22%), першую – 18 (57%), другую – 4 (12%), без катэгорыі – 3 (9%).

Навучальная ўстанова не мела магчымасці прыцягнуць высокаматываваных вучняў з іншых рэгіёнаў, бо адсутнічаў прышкольны інтэрнат. Запрасіць высокакваліфікаваных настаўнікаў таксама было складана, бо педагогам неабходна было прадастаўляць жыллё. Усё гэта ўплывала на тое, што гімназія па-ранейшаму заставалася адной з сярэдніх школ і толькі чыста намінальна насіла назву «гімназія». Рашэннем Навагрудскага РВК №345 ад 12.05.2011г. Нягневіцкая гімназія была рэарганізавана